УДК 930 (476)

# КОРЧМЫ І КАБАКІ Ў РАБОТАХ РАСІЙСКІХ ГІСТОРЫКАЎ ПЕРЫЯДУ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ

**Л.Ф. Рогач**
УА «Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы»
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

В данной статье рассматриваются различные подходы в историографии к изучению учреждений общественного питания (корчм и кабаков), анализируются исторические работы исследователей периода Российской империи по данной теме.

In this article various approaches in a historiography to studying of establishments of catering are considered (korchmas, taverns, shinkis), historical works of researchers of the period of the Russian empire on the given theme are analyzed.

Корчмы і шынкі, як тыпы ўстаноў грамадскага харчавання ў XVI – пачатку XX стст. на беларускіх землях адыгралі значную ролю ў эканамічным, сацыяльным і культурным жыцці тагачаснага соцыума.

Гістарыяграфія па гэтай тэме зараджаецца ў Расійскай імперыі ў першай палове XIX ст. Спецыяльнай працай, прысвечанай гісторыі ўстаноў харчавання, з’яўляецца даследаванне рускага гісторыка Івана Прыжова (1827-1885 гг.) “История кабаков в России в связи с историей русского народа” [1]. Прыжоў даследаваў гісторыю, вусную народную творчасць, народны быт Украіны і Расіі. Належаў да дэмакратычнага накірунку рускай гістарыяграфіі. Ставіў перад сабою наступную мэту: “На падставе законаў гістарычнага руху прасачыць усе галоўныя з’явы народнага жыцця, і кожную з іх з першых пачаткаў існавання ажно да нашых дзён ” [1, с. 8]. Напісаў працы аб рускай галечы, аб маскоўскіх прароках і юродзівых, аб быту Расіі з XI ст. па XVIII ст. і шэраг іншых работ, што так і не ўбачылі свет. Трохтомную “Историю питейных откупов в России в связи с историей народа” пачынае ствараць у 1856 – 1863-я гг. Першы том – “История кабаков в России в связи с историей русского народа” – быў выдадзены ў 1868 г. На жаль, рукапісы наступных двух тамоў, што падрабязна апісвалі быт кабакоў, І. Прыжоў спаліў, матывуючы тым, што “печатать теперь такую книгу, значит, донести на народ, значит, отнять у него последний приют, куда он приходит с горя” [1, с. 9].

І. Прыжоў у сваёй працы сцвярджае, што ў Кіеўскай дамаскоўскай Русі адсутнічала п’янства, паколькі напоі былі слабаалкагольнымі, ўжываліся толькі падчас святаў, выраблялiся ў хатніх умовах, таму прагі да іх ужывання не было, а піццё прыносіла весялосць і задавальненне. З часоў Івана IV вольная карчма ператварылася ў царскі кабак, мэтай якога быў збыт спіртных напіткаў

для атрымання прыбытку для казны. Выдаюцца забароны для гараджан і сялян на выраб спіртнога. З гэтага часу пачынаецца павальнае насаджэнне п’янства “зверху”, бо гэта стала спосабам атрымання вялікіх даходаў. Піццё ператварылася ў своеасаблівы падатак, яго аб’ём жорстка рэгламентаваўся і ўвесь час павялічваўся. Таму п’янства не з’яўляецца традыцыйнай рускай з’явай, яно было гвалтоўна навязана “зверху” рускаму народу ў другой палове XVI ст., а потым штучна пашыралася, што адбывалася як з дапамогай разгалінаванай сеткі кабакоў, так і ў выніку складаных умоў жыцця: “пілі з гора”.

У главе “История питейного дела в Юго-Западной Руси” даследуецца працэс узнікнення карчмарства і ў Беларусі. Адзначаецца, што на “заходнерускіх” землях значна даўжэй існавалі рысы старaславянскага быту, а корчмы больш працяглы час мелі вольны характар, і толькі з арэндай яўрэямі корчмаў гэтыя ўстановы ператварыліся ў інструмент спойвання народа. Тым не менш, корчмы не былі месцам толькі для продажу спіртнога, не страцілі свой статус грамадскіх устаноў, заставаліся важным месцам для вырашэння грамадскіх справаў, былі асяродкам развіцця народнай культуры. Значэнне работы І. Прыжова ў тым, што ён стварыў першае і да гэтага часу адзінае даследаванне па гісторыі піцейнай справы і п’янства ў Расіі, на Украіне, у Беларусі ад старажытнасці да 1810-х гг. Яго работу вылучае багатая інфармацыйная напоўненнасць на аснове шырокага масіву апублікаваных айчынных і замежных крыніцаў і сачыненняў гісторыкаў, а таксама звестак, сабраных падчас уласных экспедыцый.

Недахопы працы праявіліся ў яўным перабольшванні яўрэйскага ўплыву ў насаджэнні п’янства, недакладнасці цытавання крыніц і няпоўным бібліяграфічным спісе, у часта хаатычнай і несістэматызаванай падачы фактаў.

У дарэвалюцыйнай Расіі варта адзначыць работу У.К. Дзмітрыева (1868-1913 гг.) “Критические исследования о злоупотреблении алкоголя в России” [2]. У ёй дадзены глыбокі сацыяльна-эканамічны аналіз прычын і наступстваў алкагалізма, аналіз уплыву на спажыванне алкаголю прамысловых і аграрных крызісаў, неўражаяў і мераў па барацьбе з п’янствам. Абапіраючыся на статыстычныя звесткі, аўтар даказаў, што ў гады неўраджаяў і крызісаў пілі больш.

П’янству і алкагалізму, як сацыяльнаму злу, прысвечаныя работы А.Н. Аксакава (1832-1903 гг.) “О народном пьянстве” [3], Н.П. Загоскіна (1851-1912 гг.) “Пьянство и борьба с ним в старинной России. Исторические очерки” [4], Д.М. Барадзіна “В защиту трезвости (по поводу домогательств пивоваров и виноделов)” [5]. Аўтары названых прац адзінадушна сыходзяцца на крытыцы п’янства,



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

паказваюць згубнае ўздзеянне алкаголю на народ, сцвярджаюць неабходнасць больш строгага дзяржаўнага кантролю за продажам і вытворчасцю спіртнога, аналізуюць гістарычныя аспекты адміністрацыйна-прававой барацьбы з п’янствам.

Яшчэ адной цэтральнай праблемай, што турбавала даследчыкаў Расійскай імперыі, з’яўляецца вывучэнне адносінаў дзяржавы да вінакурэння, праблемы падаткаабкладання, манапольнага і тайнага гандлю. Варта адзначыць наступнага даследчыка і яго работу: І. Дзіцягін (1847-1892) “Царский кабак Московского государства” [6].

У 1901 г. выдаў сваю працу “Дзяржаўная гаспадарка Вялікага княства Літоўскага пры Ягелонах” [7] беларускі гісторык перыяду Расійскай імперыі (ураджэнец Рэчыцы) М.В. Доўнар-Запольскі (1867-1934 гг.). У працы пачынальніка беларускай нацыянальнай гістарыяграфіі разглядаюцца і аналізуюцца сацыяльныя адносіны ў сістэме дзяржаўнай гаспадаркі Вялікага княства Літоўскага (далей ВКЛ – аўт.). Частка даследавання адводзіцца аналізу заканадаўчай рэгламентацыі дзейнасці піўных устаноў на тэрыторыі дзяржавы. Прасочваецца эвалюцыя ролі вялікага князя ў рэгуляванні дзейнасці корчмаў. Гісторык прыйшоў да высновы, што да часу першага Статута вялікі князь літоўскі карыстаўся выключным правам на трыманне корчмаў. Статут 1529 г. катэгарычна забараніў трымаць тайныя корчмы і корчмы без дазволу вялікага князя. Доўнар-Запольскі сцвярджаў, што ВКЛ рана асэнсавала сваё права на корчмы, феадал доўга мусіў змагацца за права мець свае корчмы. Дазвол на карчму залежаў ад вярхоўнай улады. Права на трыманне карчмы гаспадар мог перадаць прыватнай асобе. Адсюль узнікла права прапінацыі.

Уяўляе цікавасць параўнанне трактоўкі ролі дзяржавы ў карчомным трыманні М. Доўнара-Запольскага і І. Прыжова, які таксама даследуе гэтую ролю на “заходнерускіх землях”. У адрозненне ад М. Доўнар-Запольскага І. Прыжоў адзначаў, што на землях ВКЛ карчмарства даволі доўга мела вольны характар, які выходзіць ажно за часы Люблінскай уніі. Гэты вольны характар карчмарства на землях ВКЛ адрозніваўся ад жортска рэгулюемага ў Расійскай дзяржаве. І. Прыжоў зрабіў такую выснову небезпадстаўна. Уласна на расійскіх землях кабакі ператварыліся з цэнтраў грамадскіх выключна ў месца продажу гарэлкі, ад якога ўзбагачалася дзяржава, а народ трымаўся пад кантролем шляхам затуманьвання свядомасці гарэлкай. У ВКЛ жа існаваў механізм рэгулявання дзейнасці корчмаў і шынкоў, які грунтаваўся на законе і дазваляў наладзіць эфектыўную сістэму падаткаабкладання, што дазваляла не толькі развіваць дзяржаўную эканоміку, але і эканамічна мужнець прыватным асобам –



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

уладальнікам корчмаў. Акрамя таго, урад ВКЛ імкнуўся строгім кантролем рэгламентацыі дзейнасці корчмаў перасцерагаць сваіх грамадзян ад п'янства, на што ўказвае частая ўмова ў прывілеях на трыманне карчмы, "ижбы злодейства з корчмы оное не множилися". Акрамя таго, вельмі доўгі перыяд (ледзь не на працягу ўсяго XVI ст.) існавала свабода хатняга вырабу спіртнога на ўласныя патрэбы.

Звесткі аб развіцці гандлёвых установаў можна вылучыць і ў спецыяльных зборніках, што складаліся з тэматычных артыкулаў, прысвечаных тым ці іншым праблемам («Пережитое (сборник, посвящённый общественной и культурной истории евреев в России» [8], «Живописная Россия: Отечество наше в его земельном, историческом, экономическом и бытовом значении: Литовское и Белорусское Полесье») [9].

Такім чынам, вызначым накірункі ў распрацоўках дадзенай праблематыкі ў Расійскай імперыі: 1) наяўнасць шэрагу прац, прысвечаных вывучэнню праблемы дзяржаўнага даходу ад піцейных збораў. Такія работы ўтрымліваюць аналіз развіцця акцызнай сістэмы і прасякнутыя павышаным інтарэсам да прававых мераў барацьбы з незаконай вытворчасцю і продажам спіртнога; 2) стварэнне абагульняючых работ, прысвечаных характарыстыцы п'янства як грамадскай заганы і пошуку шляхоў барацьбы і прафілактыкі п'янства ў дарэвалюцыйнай Расіі; 3) адсутнасць спецыяльных работ (за выключэннем работы І. Прыжова), прысвечаных гісторыі кабака ў шматгранных аспектах яго дзейнасці: сацыяльным, палітычным, эканамічным, грамадскім і культурным; 3) дзяржаўная заангажаваннасць: даследаванні толькі тых праблемаў, якія мелі практычную накіраванасць, дазвалялі вырашаць наяўныя праблемы, што выключала магчымасць рэалізацыі культуралагічнага падыходу; 4) узнікненне спецыяльных манаграфічных і навукова-папулярных прац прыпадае ў асноўным на 60-я гг. XIX ст., а другая хваля – на мяжу XIX – XX стст., што звязана з рашэннем ураду ўвесці ў 1894-1902 гг. дзяржаўную манаполію на вытворчасць і продаж гарэлкі ў краіне і фактычна ліквідаваць прыватную вытворчасць гэтага прадукта; 5) Зараджэнне беларускай нацыянальнай гістарыяграфіі па праблеме, якая працай М. Доўнар-Запольскага дала трактоўку прававых аспектаў дзейнасці піўных установаў у ВКЛ, адрозную ад трактоўкі расійскага гісторыка І. Прыжова.

Гістарыяграфія даследуемых дадзеных гандлёвыхасяродкаў у Расійскай імперыі развівалася ў рэчышчы двух школаў: дэмакратычнай і афіцыйнай. Для дэмакратычнага кірунку характэрны ахоп шырокага спектру пытанняў сацыяльна-эканамічнага, грамадска-палітычнага і



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

культуралагічнага зместу. Гэтыя пытанні мелі вострае сацыяльнае гучанне, закраналі і крытыкавалі недахопы тагачаснага грамадства, а таму работы даследчыкаў не публікаваліся, былі пад забаронай.

**ЛІТАРАТУРА**

1. Прыжовъ, И. Г. Исторія кабаковъ въ Россіи в связи съ исторіей русскаго народа/ И. Г. Прыжовъ.—2-е изд. – Казань: Молодые силы, 1914. – 257 с.
2. Дмитриев, В. К. Критические иследования о злоупотреблении алкоголя в России / В. К. Дмитриев. – Москва: Русская панорама, 2001. – 368 с.
3. Аксаков, А. Н. О народном пьянстве / А. Н. Аксаков // Русский вестник. – 1872. – № 11. – С. 8 – 15.
4. Загоскин Н. И. Пьянство и борьба с ним в старинной России. Исторические очерки / Н. І. Загоскин // Русское богатство. – 1893. – № 4. – С. 12 – 17.
5. Бородин Д. Н. В защиту трезвости (по поводу домогательств пивоваров и виноделов) / Н. Д. Бородин. – Петроград, 1915. – 25 с.
6. Дитягин, И. Царский кабак Московского государства / И. Дитягин // Русская Мысль. – 1882. – № 9. – С. 14 – 21.
7. Довнар-Запольский, М.В. Исследования и статьи: т. 1. Этнография и социология,обычное право, статистика, белорусская письменность / М. В. Довнар-Запольский. – Киев, 1909. – 479 с.
8. Пережитое: сборник посвящ. обществ. и культ. истории евреев в России. – СПб.: Тип. Акц. О-ва Брокгауз-Ефрон. – 543 с.
9. Живописная Россия: Отечество наше в его земел., ист., плем., экон. и быт. значении: Литов.и Белорус. Полесье / Под общ. ред. П. П. Семенова. – Минск: Беларуская энцыклапедыя, 1994. – 490 с.: ил.

УДК 947.6

# ДЕЯТЕЛЬНОСТЬ ПОЛЬСКОЙ АРМИИ КРАЙОВОЙ НА ТЕРРИТОРИИ БЕЛАРУСИ НА ЗАКЛЮЧИТЕЛЬНОМ ЭТАПЕ ВЕЛИКОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЫ (1944-1945 ГГ.)

**Н.А. Рыбак**
УО «Гродненский государственный аграрный университет»
г. Гродно, Республика Беларусь

В данной статье исследуются проблемы, связанные с деятельностью польской Армии Крайовой на территории Западной Беларуси в 1944-1945г.г. Борьба за независимость Польши и восстановление её в границах до сентября 1939 г. постепенно превратилась в террор против советских партизан, служащих Красной Армии и мирного населения, которое поддерживало советскую власть. В целом, деятельность АК носила не только антисоветский, но и антибелорусский характер.

The problems connected with the activities of Polish Army Krayova on the territory of the Western Belarus from 1944-1945 are revealed in this article. The struggle for independence of Poland and for the restoration of its frontiers as they were before September 1939 gradually turned into terror against the soviet partisans, Red Army and the peaceful population of Western Belarus, which supported the soviet authorities. On the whole, the activities of Army Krayova had not only anti-soviet, but anti-belarussian character.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ